**Алімпіяда па беларускай мове (9 клас)**

На выкананне заданняў адводзіцца: 1 гадзіна.

**1. Адзначце радкі, дзе ўсе словы можна скласці, выкарыстоўваючы асобныя з пералічаных гукаў:**

**[а ] [б ] [ав] [г] [д ] [о ] [р ] [м ] ( 4 балы ):**

1) дар,бор, дарога;

2) вораг, горб, град;

3) багор, раб, горад;

4) бягом, Рома, мёд;

5) вада, мора, дом.

**2. У якіх сказах словазлучэнні з азначальнымі займеннікамі ўказваюць на плошчу ( 6 балаў )?**

1) З усяго павета з’язджаліся сюды сяляне (Кузьма Чорны).

2) Зазвані моцна, звон, загудзі, каб пачулі цябе на ўвесь край (Міхась Чарот).

3) Блізкая страляніна ўзрушыла ўсіх, зблытала ўсе планы, усе наметкі на бліжэйшую дарогу (М.Лынькоў).

4) Амаль усе сцены і платы ў вёсцы размалёваны яго рукой (Змітрок Бядуля).

5) Ад самае раніцы рэспубліканцы маўчалі (Э.Самуйлёнак).

 **3. Адзначце сказы з арфаграфічнымі памылкамі ( 4 балы ).**

1) Месяц дугу паласкаў, выехаўшы на азёры.

2) Як ратавацца ад зладзеяў часу-мнагасерыйных фільмаў.

3) Жоўталісце гарэла ў вішнёвых садах.

4) З поўначы-Шыпаўка быстрая і паўнаводная ў’еццa.

5) А для ворагаў нашых была тая вестка, быццам з яснага неба удар Пяруна.

 **4. Адзначце прыказкі, дзе прапушчаны працяжнік ( 3 балы ).**

1) Запас есці не просіць.

2) Не печ корміць а рукі.

3) Гаспадарку весці не кашу есці.

4) Хто не дбае той нічога не мае.

5) Хмары не будзе гром не ўдарыць.

 **5. Адзначце сказы, у якіх ёсць сінанімічныя словы ( максімальная колькасць балаў-4).**

1) Хлопец падняўся, а за ім устаў і гаспадар ( І.Новікаў).

2) Ісціна, адвечная як свет: шчасце ходзіць толькі ў пары з горам (Н.Гілевіч).

3) Шуміць бярозка над Бярозай-ракой, шапоча шаўкавістым лісцем (А. Стаховіч).

4) І чаруе, і варожыць шаўкавістая трава ( М.Хведаровіч).

5) Зайграю на дудцы, вытну на гармоні, заплачу на скрыпцы аб мужыцкай долі (Цётка).

 6. Запішыце слова “среднесуточный” па-беларуску (3балы).

 7. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку расстаўлены няправільна ( 4 балы ).

1) Усё пакінуць след павінна, бо як пачаўся белы свет, прамень, пясчынка і расліна нязменна пакідаюць след.

2) Беларускія лясы, багатыя на ягады.

3) Прайшло некалькі хвілін, і ў начным паветры пачуўся гучны трэск.

4) Дрэва захісталася, зашумела галлём, і падмінаючы лазняк, рухнула ў ваду.

5) Мабыць, памыляюцца пісьменнікі, якія бачаць у восені адно заміранне жыцця.

 8. Устанавіце агульную колькасць глухіх зычных гукаў у словах ***бяздараж, вынаходства, адказчык, жаніцьба.***
**Запішыце гэты лічэбнік словам у форме творнага склону адзіночнага ліку.**
**( 4 балы ).**

.9. Запішыце ў пачатковай форме разрад, да якога адносіцца прыметнік у словазлучэнні “свінцовыя хмары”. ( 4 балы ).

 10. У якіх словах правільна падкрэслены дзейнікі? Адзначце ( 3 балы ).

1) Шасцікласнік Сяржук любіць спяваць пад гітару.

2) Добрая птушка бусел.

3) Уменне слухаць – няпростая справа.

4) Дзед з унукам пайшлі на возера.

5) Няхай кожны з прысутных напіша колькі слоў.

**11. Адзначце алфавіты, якія выкарыстоўваліся для кніганапісання на тэрыторыі Беларусі ў XIV – XVIII стст. ( 3 балы ):**

1) арабская вязь;

2) кітайскія іерогліфы;

3) кірыліца;

4) лацініца;

5) фінікійскія знакі.

**12. Запішыце назву моўнай з’явы з дзевяці літар, якаяназіраецца ў наступных**

**вершаваных радках ( 3 балы** ):

Скажу я словачка

Высока,

А ты адкажаш

… .

**Даведка**

№ 1. - 1, 5.

№ 2.- 1, 2, 4.

№ 3.- 2, 3, 4, 5.

№ 4.- 3, 5.

№ 5.- 1, 3, 4, 5.

№ 6.- сярэднясутачны

№ 7.- 2, 4.

№ 8.- дзевяццю

№ 9.- якасны

№ 10.- 2, 3, 5.

№ 11.- 1, 3, 4.

№ 12.- антанімія

**Алімпіяда па беларускай мове (10 клас)**

На выкананне заданняў адводзіцца: 1 гадзіна 15 хвілін.

**1. Адзначце сказы, у якіх няма дзейнікаў ( 6 балаў).**

1) Падарыць кветкі – гэта значыць выказаць чалавеку шчырыя пачуцці павагі і кахання.

2) На вуліцы мокра, а на ганку суха.

3) Не рэкамендуецца дарыць кветкі “халоднага” колеру – сінія, фіялетавыя.

4) Нікому не прынясуць радасці кветкі, у якіх могуць апасці пялёсткі.

5) Дзеду Талашу не спіцца.

**.2. Адзначце прыказкі, якія ўжываюцца са значэннем “без прычыны нічога не бывае” ( 4 балы ).**

1) Каб не ежка ды адзежка, была б грошай поўна дзежка.

2) Дыму без агню не бывае.

3) Каб пазнаць чалавека, трэба з’есці з ім пуд солі.

4) Каб ведаў, дзе павалішся, там саломкі падаслаў бы.

5) Каб не было снегу, не было б і следу.

** 3. Адзначце назвы прафесій, якія маюць толькі адну родавую форму незалежнага ад полу асобы( 3 балы**):

1) настаўнік;

2) акцёр;

3) рэжысёр;

4) інжынер;

5) качагар.

 **4. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову ( 2 балы ):**

1) брат – старший лейтенант = брат – старэйшы лейтэнант;

2) Вера младше Виктора = Вера маладзей Віктара;

3) Клюква крупнее брусники = журавіны буйнейшыя за брусніцы;

4) Собака смелее котёнка = сабака смялейшы за кацяня;

5) Дуб выше дома = дуб вышэй хаты.

 **5. Адзначце правільныя сцвярджэнні ( 4 балы ):**

1) аднолькава напісаныя словы ў словазлучэннях *смачны гасцінец – шырокі гасцінец* з’яўляюцца мнагазначнымі;

2) аднолькава напісаныя словы ў словазлучэннях *выпрабавальны тэрмін – музычны тэрмін* з’яўляюцца амонімамі;

3) аднолькава напісаныя словы ў словазлучэннях *хвост рыбы – хвост чаргі* з’яўляюцца амонімамі;

4) аднолькава напісаныя словы ў словазлучэннях *мора кветак – бурлівае мора* з’яўляюцца мнагазначнымі;

5) аднолькава напісаныя словы ў словазлучэннях *акцыі пратэсту - акцыі прадпрыемства* з’яўляюцца мнагазначнымі.

**6. Адзначце сказы без граматычных памылак ( 6 балаў ).**

1) Летнія дні даўжэйшыя за зімовыя.

2) За сталом сядзеў самы глухі дзед.

3) Самае найпрыгажэйшае лісце бывае ўвосень на асінах.

4) Гэта самы горшы дзень ў жыцці Андрэйкі.

5) Свіцязь – самае прыгожае возера на тэрыторыі Беларусі.

 **7. Вызначце тыя словы, дзе дапушчаны памылкі, і запішыце іх правільна ( 4 балы ).**

Адрэналін, галалёдзіца, дабраякасны, біліцёр, вакуум-камера, геадэзія, дыскамфорт, лінолеум, метровы, бугалтэр, почырк, пясчаны, блішчасты.

 **8. Выпішыце словы з прыстаўкай *а-* ( 4 балы ).**

Алёс, акунацца, азімут, адхіліць, адрас, адзенне, аповесць, аркуш, асветны, ашчаджаць.

 **9. Запішыце ў пачатковай форме, якім членам сказа з'яўляюцца падкрэсленыя назоўнікі ( 4 балы ).**

Прыемнасць – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з разумным , уда ча –
знайсціся ў патрэбе са смелым,
шчасце
– жыць і працаваць з чалавекам сумленным.

 **10. Адзначце сказы, у якіх Якуб Колас выкарыстаў фразеалагізмы ( 4 балы ).**

1) Тады, калі Сцёпка віхрыцца на вуліцы, яму кожны раз пападзецца на вочы гэта Аленка, дачка Андрэева.

2) Калі рабіць, дык трэба зрабіць гладка, каб камар носа не падтачыў.

3) Бор стары завые нудна, зашуміць галлём лаза.

4) Ды можа гэта – яшчэ плёткі, а праўды ўсёй – наплакаў кот.

5) Каму ты міл, скажы, у бядзе? Эх, не прыхілішся нідзе! Паскачаш дроздзіка, бы скочка, калі няма свайго куточка.

 **11. Якія кнігі ў старажытнасці называліся “книги ратушные” ( 4 балы )**

1) Зборнікі юрыдычных дакументаў;

2) Метрычныя кнігі;

3) Кнігі запісаў, звязаных з гарадскім самакіраваннем;

4) Зборнікі дакументаў аб уладанні маёмасцю;

5) Судовыя кнігі, у якіх уносіліся звесткі пра крадзяжы.

 **12. Вядомы мовазнавец Алесь Каўрус сцвярджае, што ў вуснай і пісьмовай мове нярэдкія выпадкі празмернасці выражэння (таўталогія, плеаназм). Адзначце сказы, у якіх маюцца неабавязковыя, лішнія словы ( 6 балаў ).**

1) Выдавецтва планавала сваю работу і выпускала падручнікі і вучэбныя дапаможнікі выключна на рускай мове.

2) Марыля шчаслівымі вачыма глядзела на сваіх дзетак.

3) На старой ліпе з усіх сіл шчыравалі буслы.

4) Старанная праца кіпіць на заводзе.

5) Дзядзька Антось безвынікова стукаўся ў дзверы розных службовых інстанцый і не мог ніяк адчыніць іх.

**Даведка**

№ 1.- 2, 3, 5.

№ 2. -2, 5.

№3. - 3, 4, 5.

№ 4. – 3, 4.

№ 5. - 2, 4.

№ 6. - 1, 5.

№ 7. – білецёр, бухгалтар.

№ 8. -  а-кунацца, а-дзенне.

№ 9.-  выказнік.

№ 10. – 1, 2, 4, 5.

№ 11. - 3.

№ 12. 3, 4, 5.

**Алімпіяда па беларускай мове (11 клас)**

На выкананне заданняў адводзіцца:1 гадзіна 15 хвілін.

 **1. Падкрэсліце словы, у якіх адсутнічае прыстаўка.** ( Максімальная колькасць балаў – 5. )

*Акоп, акругласць, акруга, акунь, алей, апаліць, апалонік, аплата, апоўдні, апорт.*

 **2. Растлумачце значэнне словазлучэнняў.** ( Максімальная колькасць балаў – 5.)

Словазлучэнне

Значэнне

*1) чорнае золата*

*2) у чорным целе*

*3) чорны дзень*

*4) чорная костка*

*5) чорным па белым*

**3. З галоўнай часткай *Прыйдзе вясна* складзіце і запішыце складаназалежныя сказы са значэннем прычыны, мэты, умовы, уступкі, параўнання.**
( Максімальная колькасць балаў – 5.)

**4. Падкрэсліце словы, правільна падзеленыя на марфемы.** ( Максімальная колькасць балаў – 5.)

*Да-вяр-а-ц-ца, да-дум-ва-ць, да-і-ць, да-кор, дакуль, дакук-а, далё-к-і, дал-і-н-а, дал-онь, дал-оў.*

**5. Перакладзіце фрагмент з пасляслоўя Францыска Скарыны да кнігі “Эсфір” на сучасную беларускую мову.** ( Максімальная колькасць балаў – 5.)

*Доконана ест книга Есфер, Божией помощию и его пречистое матери Марии к научению людем посполитым рускаго языка. Выложена працею и вытиснена повелением ученаго мужа Франциска Скорины из славнага града Полоцька, в науках и в лекарстве учителя, у великом месте Празском по летех нарожения нашего спасителя господа Іисуса Христа тысещи пятистех и девятинадесять.*

**6. Выпішыце пары рускіх і беларускіх слоў, у якіх націск падае на розныя склады.** ( Максімальная колькасць балаў – 4.)

*Годовщина – гадавіна, грабёж – грабёж, губчатый – губчаты, дочиста – дачыста, засветло – завідна, индустрия – індустрыя, осока – асака.*

 **7. Запішыце 5 назоўнікаў мужчынскага роду, якія ўтвораны пры дапамозе суфіксаў – *чык/-шчык* і маюць значэнне асобы паводле роду заняткаў, сацыяльнага стану.** ( Максімальная колькасць балаў – 5.)

 **8. Вызначце тып даданых частак складаназалежных сказаў. Укажыце, што выступае сродкам сувязі паміж даданай і галоўнай часткамі ( злучнік ці злучальнае слова).** ( Максімальная колькасць балаў – 6; 1 бал – за тып сказа, 0,5 – за сродак сувязі. )

*1) Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! ( Ф. Багушэвіч )*

*2) Якая справа, такая і слава. ( Прыказка ).*

*3) Ніякая навука не дае агню вачам і жывога румянцу шчокам, калі халодная душа дрэмле ў прамоўцы*

*( М. Кашанскі).*

4) *Сапраўдным настаўнікам можа быць толькі чалавек, які самаахвярна аддае душэўныя багацці і веды людзям (Паводле В.Віткі).*

 **9. Укажыце нумары характарыстык, уласцівых фразеалагізмам.** ( Максімальная колькасць балаў – 4.)

*1) Выступаюць у ролі аднаго члена сказа;*

*2) кампаненты фразеалагізма незамяняльныя;*

*3) вывучаюцца тэрміналогіяй;*

*4) кожны раз у тэксце ствараюцца нанова;*

*5) не выконваюць сінтаксічную функцыю;*

*6) устойлівыя;*

*7) складаюцца з двух ці болей слоў.*

 **10 Укажыце нумары характарыстык, уласцівых навуковаму стылю.** ( Максімальная колькасць балаў – 4.)

*1) Сфера выкарыстання – навука і тэхніка;*

*2) дакладнасць;*

*3) наяўнасць аргументацыі;*

*4) наяўнасць канцылярызмаў;*

*5) асноўная функцыя – пабуджальная;*

*6) ужываецца размоўная лексіка;*

*7) аб’ектыўнасць.*

**Даведка**

№ 1. А-коп, а-кругласць, акруга, акунь, алей, а-паліць, апалонік, а-плата, а-поўдні, апорт .

№2.

| |
|---|
| Словазлучэнне |

| |
|---|
| Значэнне |

1) чорнае золата

нафта

2) у чорным целе

а) надгаладзь, без дастатковага харчавання; б) вельмі строга, сурова, абмяжоўваючы свабоду д

3) чорны дзень

цяжкі, змрочны час для каго-небудзь

4) чорная костка

чалавек простага, нязнатнага (нізкага) паходжання

5) чорным па белым

вельмі дакладна, выразна, зусім пэўна, недвухсэнсава

№3.

Сказ

значэнне

Прыйдзе вясна, бо зямля чакае аднаўлення.

прычыны

Прыйдзе вясна, каб апрануць усе дрэвы ў далікатнае лісце

мэты

Прыйдзе вясна, калі не затрымаюць яе зімовыя вятры

умовы

Прыйдзе вясна, хоць злы мароз і шчыпле вушы.

уступкі

Прыйдзе вясна, нібы першае каханне ў нашае жыццё - раптоўна і нечакана

параўнання

№ 4.

Да-вяр-а-ц-ца, да-дум-ва-ць, да-і-ць, да-кор, (правільна ***дакор***), дакуль (правільна ***да-ку ль***),
дакук-а,
далё-к-і (правільна
***далёк-і***
), дал-і-н-а (правільна
***дал-ін-а),***
дал-онь, (правільна
***далонь***
),
дал-оў.

№ 5. ( прыкладны варыянт перакладу)

Скончана кніга Эсфір, з Божай дапамогай і яго прачыстай Маці для навучання людзей простых (звычайных) рускай мовы (якія гавораць рускай / старажытнай мовай). Выкладзена і выціснена па жаданні вучонага мужа Францыска Скарыны са слаўнага горада Полацка, у навуках і ў лекарстве настаўніка, у вялікім горадзе Празе ў 1519 годзе ад нараджэння збавіцеля /спаса/ нашага Ісуса Хрыста.

№ 6. Г**У**бчатый – губч**А**ты, д**О**чиста – дач**Ы**ста, индустр**И**я – інд**У**стрыя, ос**О**ка – асак**А**.

№ 7. ( варыянты магчымых адказаў)

Газетчык, канторшчык, паромшчык, пайшчык, дакладчык.

№ 8.

1) з дадзенай мэты, злучнік;

2) з дадзенай выказнікавай, злучальнае слова;

3) з дадзенай умовы, злучнік;

4) з дадзенай азначальнай, злучальнае слова.

№ 9. 1, 2, 6, 7.

№ 10. 1, 2, 3, 7.